## Ратыфікацыя мірнага дагавору.

Венскае бюро друку паведамляе, што цэнтральны выканаўчы камітэт у Маскве ратыфікаваў мірны трактат між Эстоніяй і Расіяй.

## Згода аб незалежнасьці Эстонскага гаспадарства.

Тэкст згоды між Расіяй і Эстоніяй вось які: „Гэтай згодай Расійская соцыялістычная савецкая рэспубліка прызнае бязумоўную незалежнасьць і самастойнасьць Эстонскага Гаспадарства і дабравольна навекі адмаўляецца ад усякіх суверэнных праў на Эстонскую страну і народ, якіе грунтуюцца на істнуючым дзяржаўным праваўым парадку і на міжнародных умовах, каторые ў адзначаным вышэй сэнсе трацяць сваю моц. Быўшая прыналежнасьць да Расіі нічым не абавязвае Эстонскую страну і народ у адносінах да Расіі.“